№2 (14), сакавік 2004

# Свой Лад

інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь Гродзенскага абласнога аддзяленьня ГА «Фонд імя Льва Сапегі»

у нумары:
Краіна, да якой мы ідзём ст. - 2



у нумары:
Каб сьвет не забыўся пра Беларусь ст. -3



у нумары:
БНР: міты XX стагоддзя ст. - 6






## 25-га сакавіка - Дзень абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі

# Краіна, да якой мы ідзём

***Беларусы – народ, які мае шматвекавую гісторыю сваёй дзяржаўнасьці. Яшчэ да ўтварэньня Вялікага Княства Літоўскага на этнічных беларускіх землях былі моцныя дзяржавы. Нашыя продкі бліскуча выявілі сябе як у культурных, духоўных, асьветніцкіх кірунках, вайсковай справе, такі ў галіне дзяржаўнага будаваньня. Цяжкой працай і крывавымі бітвамі даводзілася бараніць свае ідэалы. Беларусы хацелі быць вольнымі і плацілі за свабоду жыцьцём. Таму ў нас мноства славутых датаў, якія шануем і якія пацьвярджаюць старадаўнасьць нашай дзяржаўнасьці, а таксама нашую прагу да незалежнасьці. Але менавіта Дзень Волі, калі Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, маючы ўсе паўнамоцтвы, выканала волю Ўсебеларускага зьезду і абвесьціла Беларусь незалежнай краінай, стаў сама вялікім і паважаным нацыянальным сьвятам.***



Гэты дзень сьвяткуюць па ўсім сьвеце, дзе толькі ёсьць беларусы. І зразумела чаму. На пачатку 20-га стагоддзя, на эўрапейскай палітычнай прасторы склаліся такія варункі, што народ, які змог тады адбараніць сваю дзяржаўнасьць, здабываў яе назаўсёды. 25 сакавіка 1918 году, абвесьціўшы Трэцюю ўстаўную грамату Рады БНР, наш народ паставіў апошнюю кропку ў пытаньні, ці быць беларускай дзяржаве. Шматвекавая крывавая барацьба за адраджэньне сваёй незалежнасьці прывяла да лягічнага выніку і зрэалізавала мары пакаленьняў змагароў за волю. Стала канчаткова зразумела, што Беларусь будзе жыць вечна, пакуль на сьвеце будуць дзяржавы. Стала відавочным, што з волевыяўленьнем беларускага народу цяпер трэба будзе лічыцца ўсім і заўсёды. І калі хтосьці акупуе нашыя землі, то гэта толькі часовая зьява. Рана ці позна акупантам давядзецца іх пакінуць з ганьбай. Бо факт утварэньня БНР назаўсёды зняў пытаньне, ці будзе Беларусь незалежнай заможнай краінай, якой будуць ганарыцца беларусы ўсяго сьвету. Засталося толькі адно пытаньне – калі гэта будзе? А гэта залежыць толькі ад самых беларусаў.

На жаль, не да ўсіх гэта дайшло адразу. Здаецца, толькі дурні маглі ня ўцяміць, што беларусы будуць біцца за сваю краіну і ўрэшце пераможуць. Некаторыя пастанавілі, што яны ня дурні і ім гэта разумець не абавязкова. Бальшавікі, палякі, немцы, то дамаўляючыся паміж сабой, то паасобку, намагаліся падзёрці Беларусь на кавалкі. І зноў палілася кроў. За што змагаліся акупанты, па сёньняшні дзень ня ведаюць нават іх нашчадкі. Затое мы ведаем, што нашыя продкі біліся за сваю дзяржаву, за ідэалы БНР, і асьвяцілі свае імёны славай.

Бальшавікі першыя зразумелі беспэрспэктыўнасьць здушэньня беларускага нацыянальна-вызвольнага духу толькі сілай. Маючы большую частку сваёй тэрыторыі ў Азіі і адпаведна азіяцкі мэнталітэт, яны паспрабавалі падмануць беларусаў і пайшлі на саступкі. 1 студзеня 1919 году, ЦК Расейскай кампартыі змушаны быў абвесьціць беларускую савецкую рэспубліку. Гэты хітры крок нязмог аслабіць важнасьці пастаноў, прынятых 25-га сакавіка. Наадварот. Ён толькі падкрэсьліў іх веліч. Паказаў, што больш не заўважаць Беларусаў як народ, немагчыма.

Нават немцы, цалкам заняўшы Беларусь пад час Другой сусьветнай вайны, на гэты раз ужо ня "блыталі" беларусаў зь іншымі. Яны скарысталі досьвед бальшавікоў, стараліся трошачку сябраваць. Ім даводзілася лічыцца і зь мясцовымі беларускімі адміністрацыямі, ідазваляць беларускія школы, і прызнаваць беларускую сымболіку.

А вось Польшча заплаціла дарагі кошт за тое, што праігнаравала абвешчаньне БНР незалежнай і вольнай дзяржавай. Менавіта тыя, з кім яна 18-га сакавіка 1921 году падпісала Рыскую змову аб падзеле беларускіх земляў, і здрадзілі палякам у 1939-ым. Сама іранічнае ў гэтым, што СССР тлумачыў свае дзеі патрэбай аб'яднаньня заходніх беларусаў з усходнімі, і вызваленьня тых ад нацыянальнага прыгнёту. Намаганьні па зьнішчэньні беларускасьці на "крэсах всходніх", вылезьлі нішчыцелям бокам.

Беларуская нацыянальная ідэя перажыла ў 20-м стагоддзі шмат выпрабаваньняў. Яе спрабавалі зьнішчыць, імкнуліся маніпуляваць і спэкуляваць ёй. Ад гэтага яна толькі больш узмацнілася, а яе носьбіты набылі досьвед. Беларускі адраджэнцкі рух, аб'яднаны ідэаламі БНР і ўзначалены апазыцыяй БНФ у парлямэнце, змусіў Вярхоўны СаветБССР 27-га ліпеня 1990-га году абвесьціць Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце.

На гэты раз маладую беларускую дзяржаву імгненна прызналі ўсе краіны сьвету. Некаторыя нават задэкляравалі, што яны – гаранты нашай незалежнасьці. Сярод іх ЗША, Вялікая Брытанія, і нават, хто б мог падумаць, Расея. Але, як сьцьвярджае старая беларуская прымаўка, дзе шмат нянькаў, там бяз носу лялька. Расея, хіба апошняя, хто яшчэ няўцяміў, што беларуская дзяржаўнасьць нятолькі нарадзілася раней за расейскую, але яшчэ і перажыве тую. Гэты "гарант" нашага сувэрэнітэту увесь час намагаецца праглынуць нас цалкам ці па частках.

Сёньня Беларусь перажывае ня лепшыя часы. Гаротны стан не таму, што з намі хтосьці абыходзіцца ня так. Ня трэба наракаць на люстэрка, калі морда брудная. Кожны сам уладкоўвае свой лёс. Ніякія "нянькі" не дадуць таго, чаго не дамажамся самы. Бяда беларусаў ня ў тым, што ў нас ня так, як на Захадзе. Дзякуй Богу, што ня так. І ня ў тым, што ня так, як у Расеі. За гэта яшчэ большы дзякуй Богу. Бяда ў тым, што ў нас пакуль ўсё ня так, як у Беларусі. Ня так, як у той Беларусі, пра якую марылі стваральнікі БНР. Ня кепскія суседзі ў мінулым і ня сёньняшнія сябры, вінаватыя ўнашых няўдачах. Толькі тады, калі беларусы самы возьмуцца за сваё дзяржаўнае будаваньне, наша Бацькаўшчына стане ўзорам вартага і годнага жыцьця. І так будзе. Будзе таму, што за гэта дорага заплачана. Заплачана крывёй і пакутамі лепшых сыноў і дочкаў беларускага народу. Таму, што сьвята 25-га Сакавіка па-ранейшаму ёсьць для нас ідэаалам, да якога мы імкнёмся.

*Віктар Сазонаў*

# Івонка Сурвілла: Усё робім, каб сьвет не забыўся пра Беларусь

***Зь біяграфіі:** Нарадзілася 1 красавіка 1936 г. у Стоўпцах. З 1944 г. – у эміграцыі. Жыла ў Францыі, Даніі, Гішпаніі. Цяпер жыве у Канадзе. Скончыла вышэйшую Мастацкую Школу ў Парыжы, пазьней – лінгвістычнае аддзяленьне Сарбонскага ўнівэрсытэту (1959 г.). У 1958-65 гг. працавала ў беларускай рэдакцыі Гішпанскага Нацыянальнага Радыё. З 1969 г. працавала перакладніцай ангельска-французкай моваў у Фэдэральным Урадзе Канады. У 1989 г. арганізавала Канадзкі Фонд дапамогі ахвярам Чарнобылю ў Беларусі і заставалася яго кіраўніком да моманту абраньня Старшынёй Рады БНР у 1997 г. Займалася жывапісам, брала ўдзел у мастацкіх выставах. Акрамя роднай беларускай мовы валодае яшчэ васьмю: французкай, гішпанскай, ангельскай, нямецкай, дацкай, лацінскай, нарвэскай, польскай.*



**Спадарыня Івонка, раскажыце, калі ласка, пра сваю сям'ю.**

Бацькі мае – Уладзімер Шыманец з Стаўпеччыны і Эвеліна Шыманец родам з Пашкевічаў з Ішкальдзі. Я радзілася ў Стоўпцах. Выйшла замуж у 1959-ым годзе за Янку Сурвіллу зь Віленшчыны. Маю дзьвюх дочак: Ганна Прадслава цяпер кансультант у Францыі, а Паўлінка – прафэсарка ў ЗША. Маю пяцёра ўнукаў.

**У чым, на вашую думку, гістарычная важнасьць БНР?**

Беларуская Народная Рэспубліка – першая беларуская незалежная дзяржава пасьля доўгіх гадоў цяжкой няволі. Толькі дзякуючы існаваньню БНР, створаная БССР і сёньня існуе Рэспубліка Беларусь. Пад знакам БНР беларусы-патрыёты ўсім сьвеце змагаюцца за вольную і незалежную беларускую дзяржаву.

25 сакавіка – Дзень Волі ў Беларусі, які мы называем Днём Незалежнасьці, ёсьць для беларусаў сьвету найбольшае нацыянальнае Сьвята. Яго сьвяткуем у ўсіх краінах, дзе пражываем. У Канадзе, у гэтым годзе, адбудуцца сьвяткаваньні ў Таронце, у Атаве і ў Манрэалі. Пачынаецца дзень Малебнам за беларускі народ, які заўсёды завяршаецца адсьпяваньнем рэлігійнага гімну "Магутны Божа", пасьля чаго ўся грамада зьбіраецца на ўрачыстай акадэміі, пад час якой чытаюцца атрыманыя прывітаньні і даклад на тэму 25-га Сакавіка. Таксама мае месца канцэрт беларускіх песьняў, часам з танцамі і вершамі. Апошнімі гадамі з гэтае нагоды таксама арганізаваліся дэманстрацыі ў сталіцы Канады – Атаве.

**Якой бачыцца місія Рады БНР сёньня?**

Галоўная мэта Рады БНР – змагацца ўсякімі даступнымі спосабамі за незалежную Беларусь. Уважаем, што толькі ў вольнай сваёй дзяржаве зажыве наш народ заможна і шчасьліва, так як і іншыя дэмакратыі Эўропы. На жаль у гэтым мамэнце ёсьць вялікая пагроза незалежнасьці Беларусі з боку Расеі. Усё робім, каб сьвет не забыўся пра Беларусь. І каб памог нашаму народу вызваліцца ад дыктатуры. У гэтым мамэнце для нас вельмі важна, каб не закрыліся граніцы між Беларусьсю і Эўразьвязам у той час, калі нашыя найбліжэйшыя суседзі стануцца часткай аб'яднанай Эўропы.

**Якое вашае стаўленьне да маючых адбыцца парляманцкіх выбараў?**

Рада БНР не прызнае "паляту" за легітымны парлямант, бо яна створаная на падставе нелегітымнай "канстытуцыі". Канешне, кожная партыя мае права пастанаўляць, браць ёй удзел у выбарах ці байкатаваць, але вынікам ня мусіць быць стварэньне "палаты", якая потым зробіцца інструмантам для трэцяга тэрміну Лукашэнкі ці для аб'яднаньня з Расеяй.

**Ці супрацуе Рада БНР зь Вярхоўным Саветам Беларусі 13-га скліканьня?**

Мы стараліся супрацаваць зь Вярхоўным саветам 13-га скліканьня так доўга, як бачылі, што ён быў эфэктыўны. У гэтым моманце эфэктыўнасьць адсутнічае.

**Якой Вам бачыцца будучыня Беларусі?**

Вялікія надзеі пакладаю на маладое пакаленьне, якому надаела жыць у няволі і ня бачыць прычыны, чаму яму не дазволена жыць так, як жывуць маладыя людзі ў іншых эрапейскіх дзяржавах. Будучыню Беларусі вырашыць добра паінфармаваны беларускі народ з дапамогай Заходняга сьвету. Рада БНР усё робіць, каб якраз здабыць гэтую дапамогу для Беларусі.

*Распытвалі Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч*

# Змаганьне за цэнтар Эўропы

***Найвялікшая матар’яльная каштоўнасьць беларусаў—геапалітычнае месца нашай дзяржавы. Многія краіны сьвету галоўным эканамічным падмуркам лічаць эфэктыўнае скарыстаньне знаходжаньня. Прыкладам могуць ня толькі эўрапейскія Аўстрыя або Швайцарыя. Суэцкі ці Панамскі каналы ёсьць асноўнай крыніцай даходу краінаў, па тэрыторыі якіх праходзяць. Беларусь мае ажно пяць такіх “каналаў” – чыгункі, якія злучаюць Захад і Ўсход, такога ж важнага значаньня аўтадарогі, электрычныя сеткі, нафтавая магістраль і газавыя трубы. Калі яшчэ ў пэрспэктыве аднавіць шлях “з варагаў у грэкі”, то можна, набыўшы гарантыі бясьпекі ад міжнароднай супольнасьці, ладзіць свой дабрабыт.***



Але тое, што можа прынесьці дабро, пры нядбалым кіраваньні краінай можа наклікаць і біду. Усходні сусед Беларусі, ад першых дзён аднаўленьня нашай незалежнасьці, рознымі шляхамі імкнуўся завалодаць гэтым багацьцем. Расею, у дадатак да эканамічных пэрспэктываў, вабіла і выключна важнае, стратэгічна-вайсковае значаньне беларускай зямлі. Крэмль дзеіў мэтна і пасьлядоўна. Найперш трэба было разбурыць маналітнасьць нацыянальнай апазыцыі і ня даць ёй улады. Гэта ўдалося. Далей – эканамічная экспансія. Рублёвую зону і саюзную дзяржаву пачалі ствараць яшчэ Ельцын з Кебічам. Масква гатовая была падтрымваць любую ўладу ў Беларусі, якая будзе зьнішчаць нацыянальныя каштоўнасьці беларусаў (мову, сымболіку, гісторыю, культуру...). Гэта, у выніку, мусіла прывесьці да страты незалежнасьці. І таму, калі Пуцін прапанаваў Лукашэнку паглынаньне Расеяй Беларусі цалкам або губернямі, ён меў падставы чакаць станоўчага адказу. Беларуская дыпляматыя працавала ўжо толькі намінальна. “Аўтарытэт” кіраўніка беларускай дзяржавы ў сьвеце быў з знакам “мінус”. Меркаваньне міжнароднай супольнасьці, што дэмакратыю ў Беларусь прынясе Расея, была падрыхтаваная самой Расеяй. Нават некаторыя “апазыцыйныя” структуры былі гатовыя працаваць на “расейскім палітычным рынку” і (большага абсурду не прыдумаеш!) “уходзіць у аб’яднаную Эўропу праз аб’яднаньне з Расеяй. На шчасьце Аляксандар Рыгоравіч не захацеў “падвышэньня” у губэрнатары. Тады ўзмацніўся варыянт эканамічнай экспансіі. Беларусь спрабуюць купіць. Цалкам або па частках. Але Лукашэнка адмовіўся аддаць за бясцэнак газавую магістраль краіны. Расея перакрыла газ.

Беларускі народ, хіба ўпершыню масава, зразумеў важнасьць свайго геапалітычнага становішча. Бо бяз газу засталася ня толькі Беларусь, а цэлы шэраг эўрапейскіх краінаў, у тым ліку і суб’ект Расейскай фэдэрацыі – Калінінградзкая вобласьць. Шостай частцы плянэты давялося капітуляваць перад параўнальна невялікай Беларусьсю. А рэха “газавай вайны” усё не змаўкае.

Выступаючы па першым нацыянальным канале беларускай тэлевізіі, Аляксандар Лукашэнка прызнаў, што Расея не рабіла такіх дзеяньняў нават да тых краінаў, якія бяруць расейскі газ і ня плацяць за яго зусім. Ён адкрыта параўнаў дзеяньні Расеі з актам тэрарызму самага высокага роўню і назваў іх палітычным шантажом. Беларускі кіраўнік зьвінаваціў свайго расейскага калегу Пуціна ў парушэньні ранейшых дамоваў і нават папярэдзіў, што такі захад адмоўна паўплывае на пуцінскі рэйтынг. Крытыка расейскага ўраду цесна перапляталася з пагрозамі пазбавіць Расею ўсіх эканамічных ільготаў, якія яна мае ў Беларусі. Перш усяго гэта тычыцца транзыту газу. Пагрозамі справа не закончылася. Быў адкліканы для кансультацыяў беларускі пасол у Маскве, а таксама заяўлена, што горкі прысмак расейскага газу надоўга сапсаваў беларуска-расейскія дачыненьні.

На гэтым крытыка рашэньняў расейскага ўраду не прыпынілася. У тэлевізіі людзі з розных рэгіёнаў Беларусі называлі дзеяньні Расеі акупацыйнымі і правакацыйнымі. Прагучалі выказваньні, што так могуць рабіць толькі ворагі. І гэта быў ня страх перад эканамічнымі цяжкасьцямі. Уздым патрыятызму проста вырваўся з грудзей прамоўцаў. Ім упершыню за апошняе дзесяцігоддзе дазволілі сказаць пра Расею тое, што яны думаюць.

Але ні грамадзтва, ні беларуская палітычная апазыцыя не забыліся, што менавіта прарасейская палітыка Аляксандара Лукашэнкі давяла краіну да такога крытычнага стану. Пагроза страты незалежнасьці застаецца. Расея можа ўжыць нават сілу. Пакуль у яе ёсьць і іншыя сродкі ўціску на цяперашні беларускі рэжым, які ўцягнуў краіну ў саюзныя дамовы і эканамічную залежнасьць ад Масквы. Нават зараз доўжацца перамовы пра адзіную эканамічную прастору ўсёз той жа Расеяй. І гэта тады, калі кошты на энэргарэсурсы ў нас большыя, і беларускія прадпрыемствы могуць ня вытрымаць канкурэнцыі і папросту зьнікнуць. Такую палітыку абаронай нацыянальных інтарэсаў не назавеш. Таму ня дзівіць, што дыяпазон поглядаў надзеі і выказваньні кіраўніка дзяржавы вельмі шырокі. Дапускаецца як тое, што гэта чарговыя гульні Пуціна і Лукашэнкі, так і тое, што гэта піяр апошняга дзеля мажлівасьці застацца на трэці тэрмін.

Беларуска-расейскі канфлікт доўжыцца. Чым ён скончыцца – пакажа час. Дакладна ведама адно. Пакуль улада ў Беларусі ня стане бараніць нацыянальныя інтарэсы, Расея і надалей будзе складаць пляны анэксіі нашай краіны. Толькі незалежная Беларусь, пазбаўленая цяжару саюзных пагадненьняў і эканамічнага ціску, зможа скарыстацца перавагамі свайго геапалітычнага становішча, стаць гарантам як дабрабыту, так і духоўнага разьвіцьця свайго народу.

***Віктар Сазонаў***

# Дзень закаханых у Пуціна

***Пад час нядаўняй “газавай вайны” паміж Беларусьсю і Расеяй, адзін з камэнтатараў беларускай тэлевізіі ў аўтарскай праграме вельмі трапна заўважыў, што 14-га лютага – дзень закаханых, а 14-га сакавіка – дзень закаханых у Пуціна. Кампанія выбараў прэзыдэнта Расейскай Фэдэрацыі цалкам пацьвердзіла яго словы. Расея – усходняя суседка Беларусі. Гэта краіна аніяк ня можа згадзіцца з тым, што Беларусь - незалежная дзяржава, і ўвесь час спрабуе дыктаваць нам сваю волю. Таму беларусам неабыякава, што адбываецца ў Расеі, і якое кіраўніцтва прыйдзе там да ўлады.***

Ніхто не сумняваўся, што пераможа Пуцін. Такія людзі не аддаюць уладу праз выбары. Дастаткова ўспомніць якён узяў яе, не дачакаўшыся заканчэньня тэрміну Ельцына, каб зразумець, што гэты чалавек не перастане кіраваць краінай, нават калі яго тэрмін, вызначаны сёньняшняй канстытуцыяй, скончыцца. А калі нагадаць, што прыйшоў ён да ўлады на крылах чачэнскай вайны, то можна сьцьвярджаць, што пакуль будзе Пуцін – будзе і вайна.

Але праблема няў тым, што Пуцін вайны ня спыніць. Праблема мае значна глыбейшыя карэньні. Гэтую вайну не спыніў бы аніводзін кандыдат, які балятаваўся на пасаду прэзыдэнта. Вайну ня хоча спыняць расейскае грамадзтва.

Па сацыялягічных апытаньнях, праведзеных напярэдадні выбараў, расейскі выбарца на першае месца паставіў жаданьне вярнуць Расеі статус вялікай дзяржавы. Гэтае жаданьне адсунула на другое месца нават эканоміку. А праблемы вайны ў Ічкерыі нават не трапілі ў першую тройку найбольшых турботаў расейца. Гэты факт гаворыць сам па сабе. За гады кіраваньня Пуціна, агрэсыўнасьць Расейскага грамадзтва неверагодна ўзрасла. Яе зараз можна параўнаць толькі з сьляпой і бяздумнай агрэсыўнасьцю ісламскіх тэрарыстаў. Расейскае грамадзтва хоча пасылаць сваіх дзяцей на сьмерць і забойствы, дзеля задавальненьня эгаістычных вялікадзяржаўных жаданьняў.

Аніводзін з прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта Расеі ня толькі не збудаваў сваю кампанію на антываеннай тэматыцы, але і не захацеў увогуле яе агучваць. Іх больш цікавілі войны, якія вядзе ЗША, чым тая, дзе паміраюць іхныя грамадзяне. А змаганьне паміж сабой, па іхных жа сцьверджаньнях, яны вялі толькі за другое месца. У тым, што выйграе Пуцін, не сумняваліся нават кандыдаты, якія бралі ўдзел у выбарах. Такая закаханасьць у сёньняшняга кіраўніка Расеі нагадвае закаханасьць народа ў Сталіна ці Гітлера. Пуціну ўсімі расейскімі палітычнымі структурамі, а таксама грамадзтвам гэтай краіны дадзены карт-блянш на працяг той палітыкі, якую ён праводзіў, на канчатковае усталяваньне агрэсыўнай, і



нават фашысцкай ідэялёгіі.

Па дзяржаўным канале беларускай тэлевізіі адна з расейскіх грамадзянак, якая выйшла замуж за беларуса, жыве ў Беларусі, але грамадзянства зьмяняць ня хоча, сказала, што беларусы адрозьніваюцца ад расейцаў характарам. Маўляў, беларусы больш мэлянхалічныя. Гэтага цяжка не заўважыць. У параўнаньні з агрэсыўнасьцю, якая наўмысна, мэтна і сьведама выхоўваецца ў расейскім грамадзтве, большыня народаў сьвету – мэлянхолікі. А да чаго вядзе выхаваньне агрэсыўнасьці? Гісторыя вучыць, што да новых войнаў.

Як жа ў такой сытуацыі паводзіцца беларусам і украінцам? Менавіта на іх землі цяпер скіраваныя пагляды расейскіх уладных структураў і фінансавых алігархаў. Статус “вялікай дзяржавы” вымагае ад расейскага кіраўніцтва “посьпехаў” на заходнім кірунку. Выбары на Ўкраіне турбуюць Расею больш чым свае. З сваімі ўсё зразумела. А што рабіць, калі на Ўкраіне выйграюць украінцы, а ў Беларусі – беларусы?! На такі варыянт, думаю, Крэмль ужо мае распрацаваны плян дзеяньняў. Бо без кіраваньня гэтымі дзяржавамі ў Масквы цалкам развальваецца ідэя “усходнеславянскага адзінства”, і, адпаведна, не набываецца статус вялікай дзяржавы, якога так бракуе сёньняшняму расейскаму выбарцу. І ці ёсьць хоць адзн прадстаўнік, хоць адной палітычнай сілы ў Расеі, які хоць паспрабуе зьмяніць мэнтальнасьць свайго грамадзтва.

Беларусам даўно зразумела, што хто б не прыйшоў да ўлады ў Крамлі, сытуацыя ў бліжэйшы час кардынальным чынам ня зьменіцца. Нашае галоўнае заданьне – адмежавацца ад палітычнай ідэялёгіі ўсходняга суседа. Саюзныя дамовы і агульная эканамічная прастора з гэтай краінай – гэта прастора для яе і дамовы на сваю згубу. Уся гісторыя беларуска-расейскіх дачыненьняў пацьвярджае гэта.

Расейскія грамадзяне, якія жывуць у Беларусі, узялі вельмі актыўны ўдзел у выбарах. Беларуская тэлевізія паказала доўгія чэргі да выбарчых дзяльніцаў. Зразумела, што пераважная большыня галасавала за Пуціна. Іх чалавечае жаданьне жыць бязь межаў з сваёй этнічнай радзімай цалкам тлумачальнае. Як і звычайная абывательская лянота зазірнуць далей уласнага носу і падумаць, дачаго палітыка Пуціна ўрэшце давядзе. Невядомыя беларускія актывісты паспрабавалі ім гэта давесьці. У Гародні, на стэндзе мясцовага гарадзкога дома культуры, дзе было галасаваньне, і навокал былі расклееныя ўлёткі, якія тлумачылі, хто такі Пуцін і да чаго давядзе яго нае кіраваньне Расеяй. А ле ахоўнікі парадку пасьпяшаліся хуценька іх пазьдзіраць. Хіба вырашылі, што ня справа беларусаў павучаць “старэйшага брата”. І нават давесьці да таго сваю думку нельга. Маўляў, ня трэба расейскаму выбарцу ў Беларусі ведаць пра Пуціна больш, чым расейскаму выбарцу ўсамой Расеі.

Пуцін перамог. Перамог з першага тура. Цяпер прыйшоў час лічыць тых, хто пацерпіць ад яго перамогі. А такіх за гады кіраваньня Пуціна будзе ўсё больш і больш. У першую чаргу сам расейскі народ.

*Васіль Падашмянскі*

# БНР: МІТЫ XX СТАГОДДЗЯ

**Надыходзіць дзень 25 сакавіка – дзень аднаўленьня беларускай дзяржаўнасьці.**

Як заўсёды ў гэты дзень мы зьвяртаемся ўдумках дамінулага.1918 год. Згасала Першая сусьветная вайна. Яе напругі першай ня вытрымала Расея. У1917 г. адна за другой выбухнулі дзьве рэвалюцыі. На чарзе былі рэвалюцыі ў Нямеччыне і Аўстра-Вугоршчыне. Старая Эўропа – Эўропа імпэрыяў рушылася на вачох. Гэта давала шанц народам, паняволеным у гэтых імпэрыях,аднавіць страчаную калісьці дзяржаўнасьць, ці набыць яе ў тым разе, калі раней яны яе ня мелі. Імкненьні да гэтага мелі фіны, эстонцы, латышы, летувісы, палякі, чэхі, славакі, украінцы. Не засталіся ўбаку ад гэтага працэсу і беларусы. Ідэя незалежнасьці і дзяржаўнай самастойнасьці Беларусі спакваля высьпявала ў грамадзтве. Усебеларускі зьезд, які адбыўся ў сьнежні 1917 г., яшчэ не наважыўся на такі крок. Пераважалі на зьезьдзе погляды аб неабходнасьці аўтаноміі ў складзе расейскай дэмакратычнай дзяржавы. Але падзеі рушылі хутка. Грамадзкія настроі таксама хутка зьмяняліся. І вось, нарэшце, у сакавіку 1918 г. дзяржаўная незалежнасьць абвешчаная, створаная Беларуская Народная Рэспубліка. Здавалася б усё проста. Незалежнасьць, свая дзяржава – гэта неаспрэчныя каштоўнасьці для кожнай нацыі. І гэты дзень, Дзень 25-га Сакавіка мусіць стаць галоўным дзяржаўным сьвятам Беларусі. Але ня стаў. Чаму? Адказ даволі просты. Шмат мітаў было створана вакол БНР савецкай гістарыяграфіяй. Вось і Савецкага Саюзу даўно няма, а міты гэтыя жывуць і сядзяць у галовах многіх беларусаў. Таму і ёсьць патрэба разьвеяць гэтыя міты.

**МІТ ПЕРШЫ: ЗДРАДА.**

*Тыя дзеячы, якія абвясцілі БНР, супрацоўнічалі зь нямецкім і акупацыйнымі уладамі.* А што, уласна, ім заставалася рабіць? Бо акт здрады запраўды быў, але зь іншага боку. Гэта была Берасьцейская мірная дамова, падпісаная ўрадам бальшавікоў 3 сакавіка 1918 г. бяз удзелу прадстаўнікоў Беларусі. Згодна зьёй большая частка тэрыторыі краіны была аддадзена немцам без вызначэньня канкрэтнага тэрміну пад заклад кантрыбуцыі, якую мусіла была сплаціць Расея. Разьвязваючы праблему захаваньня свайго ўраду, Ленін аддаў у заклад беларускія і украінскія землі. Пачуцьцё пэўнай няёмкасьці ад гэтага засталося нават у яго. Нездарма называў ён Берасьцейскую дамову "похабной". Такім чынам, народ Беларусі, беларускія грамадзкія і палітычныя дзеячы былі змушаныя адчуць на сабе вынікі такой палітыкі суседзяў. Супраца зь немцамі была змушанай. Бо супрацьставіць ім не было чаго. Не было сваёй значнай збройнай сілы. Трэба было дамаўляцца, трэба было ўсімі магчымымі сродкамі бараніць свае беларускія інтарэсы. І ў гэтым кантэксьце шырока ведамая тэлеграма кайзэру з прапановай супрацоўніцтва і



існаваньня Беларусі пад нямецкім пратэктаратам, якая ў свой час выклікала вялікія спрэчкі між палітыкамі, а зараз сярод гісторыкаў, можа, і напэўна, была непазьбежным тактычным крокам. Так здарылася, што бальшыня з вышэйзгаданых народаў Усходняй Эўропы ішла да незалежнасьці пад нямецкім пратэктаратам. Прыкладам летувісы. У свой час яны згаджаліся прыняць да сябе нямецкага прынца фон Ураха, як караля Міндаўгаса II. А потым не адмовіліся прыняць перададзены ім Антантай ад Нямеччыны Клайпедскі край. А вось палякі. У свой час легіёны Пілсудзкага ўдзельнічалі ў вайне з боку немцаў. А калі прыйшоў час, забралі ў немцаў Познань, частку Сілезіі і Памор'я. І гэта гаворыць пра тое, што яны не былі нямецкімі марыянэткамі. Як не былі імі і дзеячы БНР.

**МІТ ДРУГІ: НЕПРАДСТАЎНІЧАСЬЦЬ І НЕЛЕГІТЫМНАСЬЦЬ.**

*Дзеячы БНР нікога непрадстаўлялі, акрамя групкі сэпаратысцкі настроенай інтэлігенцыі.* Гэтаму міту можна супрацьставіць той факт, што на Ўсебеларускі зьезд шырока абіраліся дэлегаты ад ўсіх палітычных партый і рухаў, ад усіх нацыянальных групаў, ад бальшыні паветаў Віленскай, Віцебскай, Гарадзенскай, Магілёўскай, Менскай і Смаленскай губерняў. Бралі ўдзел у зьезьдзе таксама абраныя на Ўсерасейскі ўстаноўчы сход дэпутаты. Іншая рэч, што Ўсебеларускі зьезд 31 сьнежня 1917 году быў нелегітымна разагнаны ўзброенымі бальшавіцкімі атрадамі. Але ўсё ж была абраная Рада зьезду, якая потым стала Радай БНР і якая стварыла пазьней Народны сакратарыят – Урад БНР. Такім чынам відавочна, што органы ўлады БНР былі легітымнымі.

**МІТ ТРЭЦІ: ДЭКЛЯРАТЫЎНАСЬЦЬ.**

*БНР была абвешчаная, але ніякай дзейнасьці не вяла, ня мела ўплыву на жыцьцё грамадзянаў і міжнародную палітыку.* Што можна супрацьставіць гэтаму міту? Цэлы шэраг фактаў. БНР, як усякая дзяржава, мела ня толькі свой герб і сьцяг, але і ўрад, пра які мы гаварылі вышэй. Па дамоўленасьці зьнямецкімі ўладамі пад кантроль гэтага ўраду былі пастаўленыя прамысловасьць, гандаль, асьвета і культура. Асабліва вялікія дасягненьні былі ў апошніх двух сфэрах. У той час было створана некалькі сотак беларускіх школ, адчыненая настаўніцкая сэмінарыя, выдаваліся падручнікі. Таксама была заснаваная кансэрваторыя, плянавалася адкрыцьцё ўнівэрсытэту і сельскагаспадарчай акадэміі. Быў распрацаваны Статут для выбараў мясцовых органаў улады. Выдаваліся пашпарты БНР, у тым ліку і дыпляматычныя. Канешне, такіх пашпартоў было няшмат. Ну што казаць пра тыя цяжкія пасьляваенныя часы, калі і ўнаш час на трынаццатым годзе існаваньня Рэспублікі Беларусь некаторыя грамадзяне маюць яшчэ савецкія пашпарты. Былі выпушчаныя паштовыя маркі. Да сваіх грошай рукі не дайшлі. І тут таксама можам паглядзець на суседзяў. У Савецкай Расеі свае грошы зьявіліся толькі ў 1919 годзе. У палякаў і летувісаў яны таксама зьявіліся не адразу. Складаней было з такімі важнымі атрыбутамі дзяржаўнасьці, як войскаі паліцыя. Германскія ўлады не дазволілі іх стварыць. Тым ня менш, пазьней, ужо пад час працы Ўраду БНР у Гародні, былі створаны адзін беларускі полк і плянавалася стварыць другі. Была ў Урадзе БНР вайсковая камісія, якая займалася гэтымі справамі. Што датычыць уплыву на міжнародную палітыку, то БНР была прызнаная Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Летувой, Турцыяй. Мелася свая місія ў Бэрліне. Дэлегацыя БНР брала ўдзел у Парыскай мірнай канфэрэнцыі.

З вышэйзгаданага яскрава бачым, што БНР была звычайнай дзяржавай, якая была ў стадыі станаўленьня. На жаль, гэтае фармаваньне было перарванае моцнымі і хціўымі суседзямі. Але ідэя беларускай дзяржаўнасьці не памерла. Урад БНР далей дзейнічаў на эміграцыі, а на беларускіх землях была ўтвораная БССР. Яе ўтварэньне было ініцыявана папярэднім існаваньнем БНР. І такім чынам беларуская дзяржаўнасьць працягвала існаваць да 1991 году, калі пасьля распаду СССР была ўтвораная Рэспубліка Беларусь. Ідэя беларускай дзяржаўнасьці будзе жыць, пакуль жыве Беларусь.

***Віктар Кірэеў***

# КАБ ЗАСТАЦЦА ВЕЧНЫМІ

***Чалавецтва прайшло доўгі і цяжкі шлях па стварэньні дзяржаў. Дзяржавы ствараліся як натуральным чынам, так і штучна. Заваёўнікі, панявольваючы іншыя народы, утваралі дзяржавы-імпэрыі. У іх дамінавала ідэялёгія народу-захопніка. Іншыя нацыі мусілі ці стаць рабамі, ці зьнікнуць, асімілявацца. Імпэрыі квітнелі перш усяго коштам рабаваньня паняволеных народаў. Яны не лічыліся зь іх жаданьнямі, традыцыямі, і заўсёды дыктавалі тым сваю волю. Але колькі б не існавалі імпэрыі, яны развальваліся паводле нацыянальнай адрознасьці. Кожны народ хацеў быць ня толькі сытым, але і вечным, і пэрманэнтна змагаўся за сваю незалежнасьць. Такое змаганьне магло мець розны характар, ад нянавісьці да паноўнай клясы да ўсьведамленьня сваёй нацыянальнай адметнасьці. Але ў пэрспэктыве яно мела завершыцца галоўным – стварэньнем сваёй справядлівай (адпаведна тагачасным паглядам), нацыянальнай дзяржавы.***



Нацыянальная дзяржава – утварэньне натуральнае. Да яе ўзьнікненьня вяло жаданьне этнічна блізкіх людзей зьберагчы сваю тоеснасьці, паводле сваіх пагляда ўнасьвет, адрэгуляваць дачыненьні між сабой: стварыць справядлівыя права і суд, сыстэму бясьпекі і сацыяльную абароненасьць (у сёньняшнім разуменьні). У падмурку будаваньня нацыянальнай дзяржавы ляжыць памкненьне да справядлівасьці стасунка ўжыхароў, а таксама жаданьне захаваць свае непаўторныя адметнасьці. Разьвіцьцё такога дзяржаўнага ўтварэньня ў ідэяле – гэта дасканаленьне свайго права як элемэнту справядлівасьці, а таксама добрых дачыненьняў з суседзямі, як элемэнту бясьпекі.

Не ўсё атрымвалася адразу. Гэты працэс прайшоў праз рэчышча цяжкіх спробаў і жудасных памылкаў. Кіраўнікі краінаў, каб захаваць памежную бясьпеку, нават ахвяравалі сваімі дзецьмі, прыкладам – шлюбы дзеля міру. Ламаліся чалавечыя лёсы, аслаблялася сваяцкая повязь. Такія шлюбы яшчэ не давалі поўнай гарантыі і не заўсёды маглі запазьбегнуць вайны. Ставалася і так, што бацька і дачка назаўсёды падзяляліся крывавымі войнамі паміж іх краінамі. Але падобная самаахвярнасьць дзеля захаваньня міру паўтаралася зноў і зноў. Нацыянальныя дзяржавы спарадзілі новую, вялікую ў гісторыі чалавецтва зьяву – адказнасьць кіраўніка краіны за лёс свайго народу. Зь цягам часу гэтая адказнасьць лягла на плечы цэлай клясы, якая лічылася элітнай і мела ўладу. А пасьля, з шыраньнем удзелу ў дзяржаўным будаваньні ўсё большых колаў грамадзтва, адказнасьць за лёс сваёй краіны стала ўсенароднай зьявай. Нацыянальная дзяржава, дзеля захаваньня тоеснасьці і адметнасьці свайго народу, дзеля пабудовы справядлівага грамадзтва і разьвіцьця яго культурных, духоўных і нацыянальных каштоўнасьцяў, спарадзіла трысама важныя зьявы: інстытуты дзяржаўнай справядлівасьці, сыстэму дзяржаўнай бясьпекі і, галоўнае – грамадзянскую адказнасьць кожнага за лёс сваёй краіны і наступныя пакаленьні. Такія рэчы спрыяюць выхаваньню адказнага, духоўнага і інтэлігентнага чалавека.

Зусім у іншым рэчышчы ідзе разьвіцьцё імпэрыі. Імпэрыі ёсьць утварэньнямі ненацыянальнымі і, як наступства, антынацыянальнымі. Такія дзяржаўныя ўтварэньні ня лічацца з жаданьнямі нятолькі паняволеных народаў, але і свайго. Яны, дзеля злачынных мэтаў, пасылаюць насьмерць сваіх жа грамадзянаў, дэкларуючы поўную безадказнасьць і абыякавасьць да іх лёсу. Калі нацыянальнае дзяржаўнае ўтварэньне базуецца найперш на духоўных каштоўнасьцях свайго народу, то ненацыянальнае – на матар'яльных інтарэсах і імпэрскіх амбіцыях. Новыя землі, рынкі, прыродныя багацьці, даміноўнае месца ў сьвеце – вось няпоўны пералік прыярытэтаў такой дзяржавы. Кіруе ёй не грамадзтва, а паноўная кляса, якая мае поўную ўладу і нічым не рызыкуе. Яна не ахвяруе сваймі дзецьмі дзеля міру. Наадварот. Іх дзеці маюць такія ж прывілеі, як і бацькі. У войнах праліваюць кроў іншыя. А для гэтага іншых трэба выхоўваць у духу шавінізму, фашызму, у духу нянавісьці да іншых народаў і сваёй перавагі над імі. На гэтым базуецца сыстэма выхаваньня "каштоўнасьцяў" чалавека ўненацыянальных дзяржаўных утварэньнях.

На шчасьце, гісторыя таму сьведка, натэрыторыі імпэрыі рана ці позна зноў паўстаюць нацыянальныя дзяржавы. Ніпто нямажа зьнішчыць натуральны лягічны працэс разьвіцьця чалавецтва. Яго можна толькі запаволіць, перарваць на нейкі час, але не адолець. Ніякія казкі пра "сьветлую будучыню" безнацыянальнага быцьця, ні "абдорваньне" чалавека безьліччу такіх "правоў", якія вышэй права яго нацыі і нават ня лічацца з Божымі павучаньнямі, ня змогуць перарваць ланцуг пакаленьняў. Бо калі правы чалавека, які працуе чыноўнікам, па-за межамі разуменьня права яго нацыі, то справядлівага развязаньня якой-кольвек праблемы ад яго чакаць не даводзіцца. Ня кожны чалавек хоча ахвяраваць сабой дзеля таго, што яго ня тычыцьб. Ня кожнаму трэба апякавацца нямоглымі, хворымі ці старымі. Але нацыя, як цэласьць, заўсёды ганарыцца справядлівасьцю, ахвярнасьцю і выхоўвае суайчыньнікаў паводле лепшых традыцыяў.

Ніякія безнацыянальныя дзяржаўныя ўтварэньні ня змогуць быць вечна. Яны пазбаўленыя трывалай грунтоўнай ідэялёгіі. У іх яе быцьня можа. Толькі нацыянальныя краіны могуць адбараніць свае правы, захаваць тоеснасьць і адметнасьць кожнага народу, стварыць спрыяльныя ўмовы для духоўнага разьвіцьця сваіх грамадзянаў, усталяваць на Зямлі мір і дабрабыт, выхоўваць адказных зычлівых людзей.

*Ясь Звоніч*

# “Хай воля вечна будзе з намі!”

**Лёс Макара Краўцова – яскравае адлюстраваньне лёсу цэлага пакаленьня беларусаў, якія на пачатку XX стагоддзя былі пакліканыя “людзьмі звацца”.**

Нарадзіўся Макар Краўцоў (запраўднае прозьвішча Касьцевіч) 18 жніўня 1891 году на Гарадзеншчыне ў маленькай вёсачцы Баброўня, што паблізу мястэчка Скідаль. Псэўданім паэта ўзьнік не выпадкова. Краўцовымі аднавяскоўцы называлі ягоных бацькоў, бо некалі прадзед шыў кажухі. Макар скончыў царкоўна-прыходзкую школу ў Галавачах, пасьля вучыўся ў Сьвіслацкай настаўніцкай сэмінарыі. Пасьля яе працаваў настаўнікам на Гарадзеншчыне. У 1915 годзе быў забраны ў войска расейскай імпэрыі. Там узначальваў саладацкі камітэт 44-га вайсковага фронту, ад яго быў абраны на Ўсебеларускі зьезд 1917 году – пярэдадзень БНР. Ужо тады выразна выяўляецца ягоная грамадзянская пазыцыя. Акрамя палітычнай дзейнасьці, Краўцоў працуе ў асьветніцкім кірунку. Цягам 1917-19 гадоў ён укладае “Беларускі лемантар”. На жаль, падрыхтаваная да друку кніжка так і ня выйшла ў сьвет. З 1918 году Макар Краўцоў у Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў. Пасьля ўтварэньня Міністэрства беларускіх спраў у Літоўскім урадзе ў 1919-ым ствараў беларускія органы ўлады на Сакольшчыне. З сьнежня 1919 году ўходзіў у склад так званай Беларускай вайсковай камісіі.

Першыя спробы літаратурнага пяра Краўцоў пачаў у 1918 годзе. Знакаміты цяпер ваярскі гімн “Мы выйдзем шчыльнымі радамі” быў надрукаваны як верш 30 кастрычніка 1919 году ў газэце “Беларусь”. Пазьней кампазытар Уладзімір Тэраўскі напіша да гэтых слоў музыку. Ваярскі марш стане гімнам Беларускай Народнай Рэспублікі і паўстанцаў Булак-Балаховіча.

Макар Краўцоў браў чынны ўдзел у Слуцкім паўстаньні, якое распачалося ў лістападзе 1920 году. Ён быў прызначаны загадчыкам друкарні паўстанцаў у Клецку. Краўцоў верыў у посьпех збройнага чыну. У лісьце да іншага сябра Беларускае вайсковае камісіі капітана Францішка Кушаля ён пісаў: “Патрэбен толькі добры кірунак і скарыстаньне з настрою народу. Йначай быць і ня можа. Хвалі народныя могуць перакаціцца праз галовы павадыроў”. Пазьней, у верасьні 1921-га, Краўцоў быў дэлегатам Першай Усебеларускай палітычнай канфэрэнцыі ў Празе. Пасьля паразы Слуцкага паўстаньня паэт не вярнуўся ў родныя мясьціны. З 1921 году ён жыў у Вільні, туды ж да яго прыехала жонка Ганна. Краўцоў настаўнічаў, вёў грамадзка-літаратурную дзейнасьць, рабіў пераклады клясычных літаратурных твораў. У красавіку 1923 году выдаў часопіс “Саха”, які быў адразу ж забаронены. Макар Краўцоў ліставаўся з сваякамі на малой радзіме, асаблівая прыязнасьць была ў яго з пляменьнікам Плятонам Касьцевічам. Наш знакаміты краязнавец Апанас Цыхун, які летась у Гародні выдаў кніжку “Пройдзеныя шляхі-пуцявіны” дасьледаваў лёс Макара Краўцова. Ён піша, што зь лістоў паэта вынікае, што той жыў у скрайняй беднасьці, часта прасіў пляменьніка пра грашовую падтрымку. Часам рупліўца беларушчыны апаноўваў адчай: “На жаль, нічога я цяпер не пішу. Няма куды. Душная атмасфэра дый годзі. Прыйдзецца мусі пераключыцца на іншую мову ды шрайбаваць артыкулы ў расейскія або польскія штодзёньнікі...”. Паэт і ягоная жонка часта хварэлі. Мажліва галоўнай прычынай было гнятлівае нацыянальна-грамадзкае становішча беларусаў.



*Макар Краўцоў*

У 1926-ым Макар Краўцоў быў арыштаваны польскімі ўладамі, пасьля гэтага зьнявольваўся яшчэ колькі разоў. Пасьля прыходу саветаў стала яшчэ горш. Лёс беларусаў таго гістарычнага пэрыяду – гэта лёс запраўдных пакутнікаў. З кастрычніка 1939 году Краўцоў пачаў працаваць у газэце “Віленская праўда”, але неўзабаве быў арыштаваны разам зь іншымі беларускімі дзеячамі. Спэцслужбы перавезьлі Краўцова ў Беласток, дзе ён быў закатаваны ў засьценках НКВД. Мяркуецца, што здарылася гэта ў сьнежні 1939 году. Падрабязнасьці пра апошнія дні таленавітага паэта і прамесца ягонага пахаваньня пакуль ня выяўленыя. Колькі іх, стваральнікаў БНР палягло за тое, “каб воля была вечна з намі”..

***Уладзімір Хільмановіч***

# Беларускі ваярскі гімн

*Мы выйдзем шчыльнымі радамі*
*На вольны родны наш прастор.*
*Хай воля вечна будзе з намі,*
*А гвалту мы дамо адпор!*

*Няхай жыве магутны сьмелы*
*Наш беларускі вольны дух;*
*Штандар наш бел-чырвона-белы*
*Пакрый сабой народны рух!*

*На бой! За шчасьце і за волю*
*Народу слаўнага свайго!*
*Браты, цярпелі мы даволі.*
*На бой! — усе да аднаго!*

*Імя і сілу беларуса*
*Няхай пачуе й бачыць той,*
*Хто сьмее нам нясьці прымусы*
*І першы выкліча на бой.*

*Браты, да шчасьця мы падходзім:*
*Хай гром грыміць яшчэ мацней!*
*У крывавых муках мы народзім*
*Жыцьцё Бацькоўшчыны сваёй!*

# Чый музей?

**Янка Хіліманюк (шматгадовы старшыня Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея): Людзі на вуліцы ў Гайнаўцы пытаюць, што тут робіцца, хто хоча пераняць музей?**

Самае цікавае, што папраўдзе нічога асаблівага не робіцца. Адно прагучалі словы. Ян Сычэўскі — старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства, а заадно сябра Управы Падляшскага ваяводства — запрапанаваў, каб гайнаўскі музей стаў філіялам Падляшскага акруговага музея. Паводле яго, была б ад гэтага падвойная карысць. Беласточкія музейнікі памаглі б наладзіць прафесійную працу ўстановы, па-другое: фінсавалася б яна з бюджэту маршалка Падляшскага ваяводства.

– Беларускі музей у Гайнаўцы ад пачатку перажываў вялікія цяжкасці, перш-наперш з-за недахопу грошай, — характарызуе 20-гадовы перыяд пабудовы Ян Сычэўскі. — У 1996 годзе здавалася, што яны канчаюцца. Камітэт пабудовы, Беларускае таварыства і прадстаўнікі польскага ўрада падпісалі трохбаковае пагадненне, паводле якога музей меўся стаць дзяржаўным. З таго часу становішча ўстаноў культуры ў Польшчы, аднак, рэзка змянілася. У 1998 годзе, разам з адміністрацыйнай рэформай, амаль усе дзяржаўныя культурныя ўстановы перайшлі ў кампетэнцыю мясцовага самакіравання. Таму лічу, што пераход музея ў бюджэт маршалкоўскай управы, гэта найлепшае выйсце. Ваяводскае самакіраванне мае магчымасці ўтрымаць такую ўстанову і пры добрай волі запэўніць ёй функцыянаванне.

А што, калі Падляшскім ваяводствам стануць кіраваць людзі, у якіх такой волі не будзе? – Будзе падпісана доўгатэрміновая дамова, якая забяспечыць інтарэсы музея, — кажа Ян Сычэўскі. — Але вядома, калі хтосьці кіруецца злою воляй, то заўсёды знойдзе спосаб, каб такую дамову парваць. Я аднак застаюся аптымістам. Веру, што да ўлады ў нашым ваяводстве не прыйдуць людзі варожа пастаўленыя да нацыянальных меншасцей.

Хаця не ўсе ў нас такія аптымісты, аднак не сама прапанова падпарадкаваць музей маршалкоўскай управе спарадзіла пагалоскі пра спробу яго прыхватызаваць.

– Нельга нам адкінуць такую прапанову, — кажа бурмістр Гайнаўкі. — Пабудова музея закончылася. Цяпер трэба, каб гэтая важная для горада ўстанова працавала поўным ходам. Супольна з ваяводскім самакіраваннем будзе мож на хутчэй гэтага дабіцца. Адно з такой умовай, што Падляшскі музей будзе арандаваць памяшканні ў Гайнаўцы на статутную дзейнасць, гэта значыць — прапагандаванне беларускай культуры. Права ўласнасці будынка мусіць застацца ў Гайнаўцы, за тымі людзьмі, якія будавалі музей.

„Права ўласнасці" — якраз гэтае і выклікала апошнія кантраверсіі. Яшчэ летась як быццам усё было яснае. Зямля, на якой стаіць Беларускі музей належыць Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству (на прынцыпах вечнага карыстання), а сам будынак — Грамадскаму камітэту пабудовы. Але з канцом мінулага года пабудова афіцыйна закончылася, а Камітэт пераўтварыўся ў таварыства Музей і асяродак беларускай культуры. У Гайнаўцы лічылі, што новастворанае таварыства з'яўляецца паўнапраўным спадкаемцам Камітэта. Публічна асрэчыў гэта Ян Сычэўскі ў інтэрв'ю Беластоцкаму радыё 30 студзеня:

– Уласніка будынка пакуль няма. Думаю, што будзе ім найбольш прадстаўнічая для беларускага асяроддзя арганізацыя. Якая? Пакуль не магу адказаць на гэтае пытанне, — у эфіры было чуваць смех старшыні, які падказваў, што адказ усё-такі ён ведае.

Дзеля выяснення спрэчных пытанняў спаткаліся 4 лютага ў Гайнаўцы старшыня Беларускага таварыства Ян Сычэўскі, бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, староста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочукі дырэктар Беларускага музея Янка Карпюк. Пасля сустрэчы гайнаўляне былі ўпэўнены, што пераканалі Сычэўскага ў сваіх правах да будынка. Але ён выходзячы з сустрэчы перад камерай Польскага тэлебачання падтрымаў сваё ранейшае меркаванне:

– Зямля і стары будынак належаць Беларускаму таварыству, а справа ўласніка новага будынка будзе вырашацца паводле польскага права.

* * *

– На тое, што ў Гайнаўцы ўзнік Беларускі музей склаліся некалькі прычын, — кажа Васіль Сакоўскі, які быў пры яго пабудове ад пачатку. — Па-першае, у нас быў і ёсць адданы справе беларускі актыў, па-другое, тут жыве Канстанцін Майсеня, які змог запаліць людзей да гэтай ідэі. І па-трэцяе, у нас было трохі шчасця. Тут была руіна пасля тартака. Будынкі нішчэлі, абсталяванне расцягвалі, улады за тое падвяргаліся крытыцы. Таму яны ахвотна пазбыліся клопату і перадалі нам пляцы і знішчаныя будынкі. Цяпер мы такога пляца ў цэнтры горада не атрымалі б і такога музея не пабудавалі б.

– Пра нас гаварылі, што мы будуем музей сабе, — кажа іншы ветэран пабудовы Аляксей Харкевіч, — а мы ж яго будавалі наступным пакаленням. Ужо відаць, што паўстаў прыгожы цэнтр беларускай культуры. Павінен ён быць свайго роду святасцю для ўсіх беларусаў.

Прафесар Аляксандр Баршчэўскі, які ахвяраваў на пабудову ці не найбольш грошай, нават прыгразіў, што калі музей стане ўласнасцю толькі адное беларускае арганізацыі, падасць справу ў суд.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паўтарае:

– Пакуль я на сваёй пасадзе, не дапушчу, каб права ўласнасці выйшла па-за Гайнаўку.

*Мікола Ваўранюк*
*(«Ніва», правапіс газэты)*

# Умацаваньне традыцыі

21 сакавіка ў Беластоку адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне ўгодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Арганізатарам імпрэзы, якая зьберла поўную вялікую залю людзей, выступіў Беларускі Саюз у Польшчы. Праграма распачалася выкананьнем беларускага ваярскага гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Урачыстасьць адкрыў і вёў старшыня БСП, галоўны рэдактар штотыднёвай газэты "Ніва", Яўген Вапа. Ён падараваў кветкі тром намінантам, якія вызначыліся руплівасьцю на Беласточчыне ў галіне беларушчыны - дырэктару беларускага ліцэю ў Гайнаўцы Яўгену Сачку, войту гміны Чыжы Юрку Васілюку і прадпрымальніку Міраславу Пякарскаму. Слова меў доктар навук, аўтар некалькіх кніг па гісторыі Беларусі, Яўген Міравовіч. Ён падкрэсьліў гістарычную значнасьць БНР. Наступным прамаўляў Віктар Сазонаў з Гародні, які прывітаў беласточцаў ад імя гасьцей зь Беларусі. Абодва выступоўцы, ня гледзячы на складаную грамадзка-палітычную сытуацыю ў Беларусі, выказалі ўпэўненасьць у тым, што Беларусь будзе паўнавартаснай незалежнай дзяржавай, якой будуць ганарыцца беларусы ўсяго сьвету. Сьвята прадоўжылася выступам ведамага менскага барда Зьміцера Сідаровіча, які ня толькі выконваў свае творы, але і ўспомніў пра сваю студэнцкую практыку на Беласточчыне. Далей імпрэза ішла ў кавярні "Цэхова" пад куфаль піва. Гітара ішла з рук у рукі, так што атрымалася запраўдная вечарына беларускамоўнай песьні. Воклічы беларусаў падтрымалі і мясцовыя палякі, якія захоплена апляндавалі выканаўцам. Варта дадаць, што сьвяткаваньне Дня Волі на Беласточчыне, дзякуючы перш усяго Беларускаму Саюзу, укараняецца як трывалая традыцыя.

*Ладзік Майніч*



***Наваградак – велічная сталіца Вялікага Княства Літоўскага, унікальны горад на ўзвышшы, сама высокай мясьціне Гарадзеншчыны. Для беларуса ён нібы родны дзед, мудры і павучальны. У Наваградак немажліва не закахацца, трапіўшы туды аднойчы, хочацца прыязджаць яшчэ і яшчэ. Ён прыгожы ў любую пару году – і ў пранізьлівы студзеньскі сівер, калі сьнегу на старых завулках па пояс, і ў яснае лета, калі з Замкавай гары вока зачароўваюць далягляды. Колькі гадоў таму цэнтральныя пляцы гораду празьмерна закаталі ў каменную плітку, нібы хацелі пératварыць сераднявечча ў мэмарыял. Зьнішчыць амаль тысячагадовы ліцьвінскі дух немажліва. Наваградак ня страціў свой шарм і па-ранейшаму вабіць падарожніка.***

Горад быў заснаваны на мяжы X-XI стагоддзяў (першы ўспамін у гістарычных дакумэнтах – 1044 год), пазьней стаў калыскай Вялікага Княства Літоўскага. У горадзе праходзілі дзяржаўныя соймы, паседжаньні Галоўнага літоўскага Трыбуналу – найвышэйшага суду краіны, афіцыйныя сустрэчы князёў і каралёў. У розныя часы быў розным палітычны статус і роля Наваградку ў дзяржаве, але праз стагоддзі ён зьберагаў сваю адметнасьць.

Пра былую веліч Наваградку нагадваюць руіны замку 13 ст., які пасьля каранацыі Міндоўга ў 1252 г. стаў рэзыдэнцыяй вялікіх князёў літоўскіх. Замак будаваўся ў чатыры этапы з 13 па 16 ст., меў 7 вежаў, палац, Замкавую царкву. Цытадэль была моцна разбураная ў вайне Рэчы Паспалітай з Масквой у 1654-1667 гг. і ў 1706 г пад час Паўночнай вайны. Зьбераліся толькі рэшткі дзьвюх вежаў, земляныя валы, глыбокі роў. На дарозе, што вядзе на гару, знак-герб Наваградку на камені.


Гандлёвыя рады

Непадалёк Замкавай гары ўзвышаецца гара Міндоўга. Паводле мясцовага паданьня там пахаваны заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага Міндоўг. У 18 – пачатку 20 ст. на гары былі хрысьціянскія могілкі. У 1993 годзе ля гары Міндоўга быў пастаўлены помны знак.

Паміж узвышшамі стаіць Фарны касьцёл Перамяненьня Гасподняга (1712-23), ён пабудаваны намаганьнямі біскупа Мацея Анцата на месцы храма 15 ст., які заснаваў Вялікі князь Вітаўт. У 1422 г. у гэтым храме адбыўся шлюб караля Польшчы і князя ВКЛ Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай. У касьцёле 12-га лютага 1799 г. быў ахрышчаны Адам Міцкевіч. У капліцы касьцёлу зьмяшчаецца саркафаг з парэшткамі 11-ці сясьцёр-назаратанак, расстраляных гітлераўцамі ў 1943 г.

Паблізу замкавай гары курган Адама Міцкевіча, насыпаны ў 1924-31 гг., вышыня да 17 мэтраў, у кургане зямля, прывезеная з краінаў, дзе жыў вялікі паэт. Ля кургану ў 1998 г. усталяваны помны знак. Бліжэй да цэнтру места адметны помнік Міцкевічу аўтарства скульптара Валер'яна Янушкевіча. Ён быў пастаўлены ў 1992 г.

Барыса-Глебская царква (1517-19), пабудаваная на месцы храма 12 ст., доўгі час была катадрай праваслаўных, а калі належала Базыльянскаму ордэну, уніяцкіх мітрапалітаў. У 19-пач. 20 ст. у ёй


Дом-музэй Адама Міцкевіча

Мікалаеўскі сабор



зьберагалася цудатворная ікона Маці Божай Навагрудзкай.

Іншы помнік мураванага дойлідзтва – касьцёл Сьвятога Міхала Арханёла (1-я пал. 18 ст.), пабудаваны як касьцёл дамініканскага кляштару на месцы драўлянага касьцёлу, фундаванага ў 1624 г. Крыштопам Хадкевічам. Храм перабудоўваўся ў 1724 г. і пасьля пажару 1751 г. Пры кляштары з канца 18 ст. да 1830-х гг. дзеіла дамініканская школа, у якой вучыліся Адам Міцкевіч, Ян Чачот, іншыя ведамыя асьветнікі.

Цяперашні Мікалаеўскі сабор (1780), быў пабудаваны як касьцёл пры кляштары францішканаў. У 1846 г. ён стаў праваслаўным храмам, пасьля аднаўленьня ў 1991 г. Навагрудзкай епархіі ёсьць саборнай царквою.

Дамініканскі касьцёл



Ёсьць у сеньняшнім Навагрудку і мячэт. Яго цяперашні будынак заснаваны на месцы папярэднягаў 1855 г. Пасьля Другой сусьветнай вайны храм мясцовых татараў, якія вызнаюць іслам, быў зачынены. У 1997 г. мячэтзноў стаў дзеіць.

Фарны касьцёл



Зь іншых помнікаў архітэктуры варта згадаць колішнія гандлёвыя рады на цэнтральным пляцы (пабудаваныя ў 1833 г.), разам зь імі ансамблем глядзіцца старая забудова гарадзкога пляцу (будынкі другой паловы 19 ст.); будынкі канца 1920-ых гадоў: былы дом ваяводы, былы чыгуначны вакзал (цяпер аўтавакзал), жылы дом таго часу.

У горадзе ёсьць два музэі – Гісторыка-краязнаўчы музэй (адлюстроўвае гісторыю ад старажытнасьці да 1945 г. і мае адметную экспазыцыю) і Дом-музэй Адама Міцкевіча. Апошні быў пабудаваны ў пачатку 19 ст., а цяперашні выгляд займеў пасьля чарговай рэканструкцыі ў 1989-90 гг. Першы музэй у гэтым доме быў адчынены яшчэ "за польскім часам", а апошняе дзесяцігоддзе яго экспазыцыя стала абнаўляецца.

Барыса-Глебская царква



Пералічаць усіх знакамітых людзей, якія нарадзіліся, працавалі, вучыліся ў старадаўняй сталіцы няма сэнсу. Іх так шмат, як ні ў адным горадзе Гарадзеншчыны. Зьезьдзіце ў Навагрудак, пашпацыруйце па ім і вы зразумееце чаму.

***Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч, фота аўтара***






бюлетэнь «СВОЙ ЛАД»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня
распаўсюджваецца задарма
пры перадруку спасылка абавязковая

рэдактар - Віктар Сазонаў
стылёвае рэдагаваньне - Ладзік Майніч
шыхтоўля - Генрых Рэзьнік
падрыхтаваны да друку: 21. 03. 2004
e-mail: sazonau@tut.by
адрас для ліставаньня: 230023, Гародня, а\с 121

